VII Велікодная Нядзеля

Аўтар: кс. Яраслаў Грынашкевіч
08.05.2016 00:00



З Евангелля св. Яна

Езус узняў вочы свае да неба і маліўся такімі словамі: “Ойча святы, не толькі за іх прашу Я, але і за тых, хто паверыць у Мяне паводле слова іхняга, каб усе былі адно, як Ты, Ойча, ува Мне, і Я ў Табе, каб і яны былі ў Нас, каб паверыў свет, што Ты паслаў Мяне. І славу, якую Ты даў Мне, Я даў ім, каб былі адно, як і Мы адно. Я ў іх, а Ты ўва Мне. Каб былі з’яднаныя ў адно, каб свет пазнаў, што Ты паслаў Мяне і палюбіў іх, як палюбіў Мяне. Ойча, хачу, каб тыя, каго Ты даў Мне, былі са Мною там, дзе Я ёсць, каб бачылі славу Маю, якую Ты даў Мне, бо палюбіў Мяне перад заснаваннем свету. Ойча справядлівы, свет не пазнаў Цябе, але Я пазнаў Цябе, і яны пазналі, што Ты паслаў Мяне. І Я адкрыў ім Тваё імя і буду адкрываць, каб любоў, якою Ты палюбіў Мяне, у іх была, і Я ў іх”. †

Ян 17, 20–26

Моц малітвы

Гэтая малітва павінна часта гучаць у нашых сэрцах. Яна датычыцца нас. Езус памятаў не толькі пра сваіх самых блізкіх вучняў, але, дзякуючы гэтай просьбе да Айца, і мы прысутнічалі ў Вячэрніку! Усведамленне сабе гэтага факта не можа не паўплываць на ўсё, што мы думаем і што робім у жыцці. Малітва Езуса – Сына Божага – за дзень да крыжовай смерці павінна быць эфектыўнай! У ёй заключана сіла пераканання нашага хрысціянства перад аблiччам свету. Давайце прызнаем з пакорнасцю, што нам не вельмі ўдаецца... Свет не без цяжкасцей прымае праўду аб збаўленні, ахвяраваным Езусам. Чаму? За тое, каб свет пазнаў і прыняў Бога, маліўся ж сам Пан Езус! Адказ трэба шукаць у тым, што мы нават не спрабуем пазнаць Езуса так, як Ён гэтага ад нас чакае. Нашыя веды больш чым павярхоўныя. А што яшчэ горш, мы не адчуваем жадання змяніць гэтае становішча рэчаў. Ён гэта прадбачыў, а таму маліўся за нас і зрабіў усё, каб стала інакш...